# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
8 верасня
1994 года
№ 6(1711)


УВАГА!

## Пажаданне першакурснікам рэктара БДУ Фёдара Мікалаевіча Капуцкага



*Ф. М. Капуцкі нагадаў:*
*— Чаму ты бедны?*
*— Таму што дурны.*

*У гутарцы з карэспандэнтам «Беларускага універсітэта» Марынай Гуляевай рэктар БДУ даў наказ першакурснікам:*

— Хацелася б, каб нашы першакурснікі навучыліся вучыцца. Бо ВНУ — гэта ўсё ж не школа, у ёй навучальны працэс пастаўлены па-іншаму. Каб яны навучыліся размяркоўваць свае сілы і кіраваць сваім часам. Сёння распаўсюджана думка, што веды — не прэстыжныя. На мой погляд, гэта памылкова, бо дзе б ты ні быў, але калі ў цябе нешта ёсць у галаве, ты паўсюль будзеш патрэбны. Гэта па-першае. А па-другое, краіна багацее толькі тады, калі развітыя навука і адукацыя. Бо для таго, каб нешта выраблялць, патрэбны спецыялісты.

У мой час, калі я паступаў, у 49-м годзе усё было па-іншаму. Кантроль быў такі жорсткі, што за прапушчаныя заняткі маглі адлічыць. Ведаеце, чатыры гады пасля вайны, краіна толькі падымаецца на ногі... Сёння ў маладога чалавека больш магчымасцей, і хацелася б, каб ён іх выкарыстоўваў.

### АДНЫМ СКАЗАМ

** У гэтым годзе наш універсітэт прыняў на першы курс дзённага аддзялення 1682 чалавекі. Яны будуць навучацца бясплатна. А 301 чалавек залічаны на першы курс з умовай аплаты імі свайго навучання.*

** Міністрам адукацыі і навукі нядаўна стаў Васіль Стражаў. У былым урадзе ён займаў пасаду намесніка міністра адукацыі.*

** З дзесяці мільёнаў неабходных агульных сшыткаў будзе выраблена ў лепшым выпадку тры з паловай мільёны. У жніўні «Герой працы», не зрабіўшы вялікага подзвігу, накіраваў у магазіны 380 тысяч сшыткаў. Зараз Міністэрства гандлю шукае магчымасці закупак за мяжой. Але, як паказвае практыка, расійскія і літоўскія сшыткі значна даражэй за айчынныя...*

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД

**ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** агульнай фізікі, надзейнасці вырабаў радыёэлектронікі, метадаў аптымальнага кіравання, тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі, радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, найноўшай гісторыі славянскіх краін, тэорыі літаратуры.

**ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ:** тэарэтычнай механікі і робататэхнікі, тэарэтычнай фізікі.

**ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** фізічнай электронікі, матэматычнага забеспячэння ЭВМ, ураўненняў матэматычнай фізікі, матэматычных метадаў тэорыі кіравання, мікрабіялогіі, генетыкі і біятэхналогіі, зарубежнай літаратуры, этыкі і эстэтыкі, псіхалогіі, эканамічных навук.

**СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** кібернетыкі, вышэйшай алгебры, фізічнага выхавання і спорту.

**АСІСТЭНТАЎ (ВЫКЛАДЧЫКАЎ) КАФЕДРАЎ:** радыёфізікі, геаметрыі, тапалогіі і методыкі выкладання матэматыкі, тэорыі функцый, агульнай матэматыкі.

Тэрмін конкурса — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, т. 26-59-39.

Аб'ява надрукавана ў газеце «Беларускі універсітэт» 8 верасня 1994 года.

## МІЖНАРОДНЫЯ КАНТАКТЫ

5—10 ліпеня ў Празе праходзіла сустрэча прадстаўнікоў маладзёжных арганізацый і студэнцкіх прафсаюзаў Еўропы. Ад Свабоднага прафсаюза студэнтаў на ёй прысутнічаў студэнт гістарычнага факультэта Алег Новікаў. Былі абмеркаваны праблемы супрацоўніцтва еўрапейскай моладзі і пытанні каардынацыі дзеянняў. На Беларусь былі запрошаны ўдзельнікі індэйскіх хваляванняў у Мексіцы, прадстаўнікі германскай моладзі.

## ЗАЯВА ЗАДЗІНОЧАННЯ БЕЛАРУСКІХ СТУДЭНТАЎ

23-га жніўня Задзіночанне Беларускіх Студэнтаў распаўсюдзіла заяву, у якой акцэнтуецца ўвага на тое, што да гэтага часу ў так званай «чарнобыльскай зоне», напрыклад, у Нароўлі, Хойніках, Буда-Кашалёве, дзейнічаюць сярэднія спецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы. Гэта лічыцца недапушчальным, бо вучоба — у зоне радыяцыйнага забруджвання пры радыяцыі 17 кюры на квадратны кіламетр (як, напрыклад, ПТВ сельскагаспадарчай вытворчасці ў Нароўлі — месцы, дзе забаронена вядзенне сельскагаспадарчай вытворчасці). Зыходзячы з гэтага, ЗБС патрабуе перасяліць гэтыя навучальныя ўстановы разам з навучэнцамі ў чыстыя раёны Беларусі.

## ТРАДЫЦЫЯ СТАНЕ ГІСТОРЫЯЙ?

Паводле дадзеных, якія атрымала карэспандэнт «Беларускага універсітэта» Марына Гуляева з вучэбна-метадычнага ўпраўлення універсітэта, на бульбу сёлета паедуць толькі 125 чалавек. Гэта ў восем разоў менш у параўнанні з мінулым годам. Прычын можна вылучыць некалькі — няма чым плаціць студэнтам, не чакаюць вялікага ўраджаю і — бульбы мала пасадзілі.

Але пакінем эканамічны бок праблемы. Знікае традыцыя, якая для многіх студэнтаў, што не перажылі яе, ужо будзе толькі гісторыяй.

ВЕСТКІ З БІБЛІЯТЭКІ

## ВЫРАТОЎВАЮЦЬ ФОНДЫ

**У два разы менш назваў новых кніг атрымала сёлета універсітэцкая бібліятэка. А па некаторых накірунках — у пяць і больш разоў. Адзінае, што пакуль ратуе бібліятэку,— гэта яе фонд, які складае 2 мільёны кніг. І яшчэ хітрыкі непасрэдна нашых работнікаў бібліятэкі, якія частку неабходнай літаратуры дастаюць у прыватных фірм. Як кажа Ірына Уладзіміраўна Арэхоўская, дырэктар бібліятэкі, замест таго, каб выдаткоўваць свае веды на бібліятэчныя патрэбы, яны пераўтвараюцца ў здабытчыкаў.**

**М. ГУЛЯЕВА.**

ДОШКА АБ'ЯЎ

## НАВІНЫ КІНО

Нацыянальная бібліятэка РБ, клуб С. Фяненкі прадстаўляе на вялікім экране пост-элітарнае кіно.

«Фартэпіяна» Джэйна Кэмпіёна 8—9—10 верасня ў 16.30 і 18.45.

«Тры колеры: сіні» Кшыштафа Кіслеўскага 12—13—14 верасня ў 16.30 і 18.45.

«Бывай мая наложніца» Чэна Кайге 15—16—17 верасня ў 15.30 і 18.45.

«Высокія абцасы» Пэдра Альмадавара 19—20—21 верасня ў 16.30 і 18.45.

● У НАШЫХ СУСЕДЗЯЎ

# БУДЗЕ Ў МІНСКУ СВОЙ ГАРВАРД

*Ці хацелася б вам атрымаць інстытуцкі дыплом еўрапейскага ўзроўню па прэстыжнай спецыяльнасці права ў беларускай сталіцы? Калі такое жаданне ёсць, дык давайце завітаем у прыёмную камісію Мінскага гуманітарна-эканамічнага недзяржаўнага інстытута, які сёлета праводзіць свой першы набор студэнтаў.*

**Размясціўся ён у карпусах абласнога інстытута ўдасканальвання настаўнікаў на вул. П. Глебкі, 88. Тут праз месяц сядуць за парты студэнты трох факультэтаў — лінгвістычнага, эканомікі і кіравання, дзяржаўнага будаўніцтва і права. А тры астатнія факультэты — славянскі, сродкаў масавай камунікацыі і гуманітарна-тэалагічны — атрымаюць «прапіску» ў іншых сярэдніх і вышэйшых навучальных установах горада.**

**— Яшчэ некалькі гадоў назад у мяне з'явілася думка аб стварэнні вышэйшай навучальнай установы, якая б у вышэйшай ступені адпавядала патрабаванням сённяшняга дня, працавала на будучыню беларускага грамадства,— гаворыць рэктар інстытута, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Аляксандр Мікалаевіч Алпееў.— А вось ажыццявіць гэтую мару на практыцы дапамагло беларуска-германскае прадпрыемства «Канцэрн Анкор», якое ўзначальвае Іван Уладзіміравіч Анташкевіч. З дапамогай спонсараў мы — ініцыятыўная група выкладчыкаў і вучоных — распрацавалі перспектыўную праграму дзейнасці новай ВНУ. Апрача сучасных методык навучання яна прадугледжвае стварэнне ўласнай матэрыяльнай базы — вучэбных і адміністратыўных карпусоў, лабараторый, камп'ютэрных класаў і нават плавальнага басейна.**

**— Навучанне ў нашым інстытуце платнае. Плата не перавышае 300 долараў у год у пераводзе на рублі па адпаведнаму курсу,— адзначыў сакратар прыёмнай камісіі Георгій Іванавіч Папко.— Для завочнікаў плата вызначана ў памеры 200 долараў у год. Але для тых студэнтаў, якія пакажуць асаблівыя поспехі ў вучобе, прадугледжана зніжэнне або адмена платы за навучанне. Ім нават будзе выплачвацца стыпендыя. Так што, як бачыце, для таленавітых і старанных у нас адчынена «зялёная» вуліца.**

**Варта ўлічваць, што ў гуманітарна-эканамічным інстытуце іншагароднія студэнты будуць забяспечвацца інтэрнатам, як у дзяржаўных ВНУ. Не трэба скідваць з рахунку і тое, што ўсе жадаючыя змогуць асвоіць ў гэтай навучальнай установе замежныя мовы па сучаснай методыцы, атрымаць правы вадзіцеля, пасведчанне аператара ЭВМ, рэферэнта-перакладчыка. А гэтыя спецыялісты сёння як паветра патрэбны ў самых разнастайных галінах вытворчасці, іх з нецярплівасцю чакаюць у банкаўскіх і гандлёва-камерцыйных структурах. Урэшце, інстытут будзе аказваць вялікую дапамогу выпускнікам пры працаўладкаванні па выбранай спецыяльнасці.**

**Можна з упэўненасцю сцвярджаць: стаць студэнтам новай вышэйшай навучальнай установы — вельмі перспектыўна. А каб атрымаць доўгачаканы студэнцкі білет, дастаткова паспяхова прайсці субяседванне па двух прафілюючых дысцыплінах. Для тых, хто падаў дакументы на факультэт эканомікі і кіравання, гэта матэматыка і замежная мова. Абітурыенты, якія жадаюць вучыцца на славянскім факультэце, павінны прадэманстраваць пэўныя веды па беларускай (рускай) мове і літаратуры, а таксама замежнай мове. На астатнія чатыры факультэты дысцыпліны для субяседвання аднолькавыя — гісторыя Беларусі і замежная мова.**

● ЗАПРАШЭННЕ

# ТАЛСТОЙ — ГЭТА ЦЭЛЫ СВЕТ, ЦІ НА СУСТРЭЧУ З Л. ТАЛСТЫМ

Верасень — месяц, у якім нарадзіўся Л. М. Талстой (1828—1910 гг.).

З гэтай нагоды аддзел рэдкай кнігі бібліятэкі універсітэта змяшчае ў газеце інфармацыю аб творах пісьменніка, якія захоўваюцца ў аддзеле і прадстаўлены Поўным зборам твораў, Зборам твораў, асобнымі, факсімільнымі і мініяцюрнымі выданнямі. Гэтыя выданні друкаваліся, у асноўным, у канцы XIX і пачатку XX стагоддзяў вядомымі кнігавыдаўцамі, ілюстраваліся лепшымі мастакамі таго часу. Хочацца напісаць некалькі слоў аб выданнях твораў Л. М. Талстога, якія выдаваліся вядомым кнігавыдаўцом-асветнікам Сыціным І. Я. (1851—1934 гг.). У аддзеле рэдкай кнігі захоўваецца 24-томнае Сыцінскае выданне твораў Талстога, якое рэдагаваў П. І. Бірукоў (пісьменнік, які добра ведаў Л. М. Талстога і яшчэ пры яго жыцці пачаў пісаць манументальную працу ў 4-х тамах «Біяграфія Льва Мікалаевіча Талстога»).

Але сапраўднымі шэдэўрамі выдавецкай справы Сыціна лічацца пасмяротныя выданні твораў Л. М. Талстога. Для гэтай працы Сыцін запрасіў самых таленавітых тыпографаў, пераплётчыкаў, мастакоў і рэдактараў. Двухтомнік «Анна Каренина» ілюстравалі М. Шчаглоў, А. Мараваў і А. Корын. Твор «Воскресение» выйшаў з малюнкамі Л. Пастэрнака. Асобнымі выданнямі выйшлі «Драматычныя творы», двухтомнік «Аповесці і апавяданні». Знешні выгляд усіх гэтых выданняў вельмі прывабны, надрукаваныя яны на якаснай паперы, аформлены ў прыгожыя пераплёты.

У аддзеле захоўваецца і 90-томнае юбілейнае выданне твораў Талстога. Нават сёння гэта самы поўны збор твораў пісьменніка.

Захоўваюцца ў аддзеле цікавыя літаратуразнаўчыя выданні аб творчасці Л. М. Талстога. Гэта Д. Н. Аўсянка-Кулікоўскі «Збор твораў» т. 3, 1913 год выдання, «Л. М. Талстой (да 80-годдзя вялікага пісьменніка)», 1908 год выдання, М. С. Грамека «Апошнія творы графа Л. М. Талстога (крытычны эцюд)» і інш.

Нельга не назваць кніжку Я. Салаўёва «Л. М. Талстой (яго жыццё і літаратурная дзейнасць)» з серыі «Жыццё выдатных людзей» Ф. Паўленкава 1897 года выдання (заснавальніка гэтай серыі).

Усе гэтыя выданні, як і многія іншыя, бібліятэка універсітэта прапануе Вашай увазе.

**Загадчыца аддзела рэдкай кнігі Л. П. МІЦКЕВІЧ.**

● ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

# ВЕРАСЕНЬ

**11 верасня 1919 года.** Надрукавана пастанова Народнага камісарыята асветы РСФСР «Аб арганізацыі рабочых факультэтаў пры рабочых універсітэтах».

**26 верасня 1923 года.** На агульным сходзе БДУ было вырашана, што ўсе камсамольцы павінны здаць залікі па беларускай літаратуры і беларускай мове.

Верасень. У прыёмную камісію універсітэта на 100 месц пададзена 1500 заяў. Упершыню ўведзены ўступныя экзамены для абітурыентаў, а таксама вытворчая практыка для студэнтаў.

**1 верасня 1926 года.** Агульны сход супрацоўнікаў універсітэта выказаў салідарнасць з забастоўкай вугляколаў у Англіі і пастанавіў адлічыць у фонд дапамогі 1% заробка. 16—19 верасня. Ва універсітэце адбылася І Усебеларуская канферэнцыя па прыродазнаўству. З дакладамі выступілі рэктар У. І. Пічэта, праф. С. Я. Вальфсон і інш.

20—25 верасня. Ва універсітэце адбылася Усебеларуская літаратурна-лінгвістычная канферэнцыя.

Верасень. Універсітэт атрымаў з-за мяжы прыборы для абсталявання хімічных лабараторый.

**1927 год. Верасень.** Ва універсітэце адкрыты факультэт права і гаспадаркі. Дэкан — праф. С. Я. Вальфсон.

**1928 год. Верасень.** Рабфакаўцы вырашылі перадаць заробленыя на будоўлі універсітэцкага гарадка грошы на карысць індустрыялізацыі краіны.

**1930 год. Верасень.** У памяшканні універсітэта на Земляробчым завулку адкрыта студэнцкая сталовая на 2 тыс. абедаў у дзень.

**1931 год. Верасень.** Хімічнае аддзяленне педагагічнага факультэта ператворана ў хімічны факультэт.

**1934 год.** Ва універсітэце адкрыты гістарычны факультэт. У склад яго ўваходзяць кафедры гісторыі СССР і БССР, гісторыя старажытнага свету і сярэднявечча.

**1938 год.** Верасень. Партбюро БДУ вызначыла парадак работы 111 палітгурткоў. У новым навучальным годзе ў іх будуць займацца 1550 чалавек.

**1939 год. Верасень.** Студэнты БДУ ў складзе агітбрыгады 20 дзён правялі ў Заходняй Беларусі (Маладзечна, Ашмяны).

**1 верасня 1944 года.** Створаны факультэт журналістыкі і кафедра тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку.

**1945 год. Верасень.** Уведзены нагрудны знак для тых, хто скончвае дзяржаўныя універсітэты.

**1948 год. Верасень.** Закончана аднаўленне разбураных у гады Вялікай Айчыннай вайны будынкаў БДУ. Урад БССР выдзеліў на пашырэнне матэрыяльнай базы універсітэта дадаткова 1,9 млн. руб.

**1952 год. Верасень.** Рэктарам БДУ прызначаны К. І. Лукашоў.

**1953 год. Верасень.** Адкрыта кафедра фізічнай оптыкі.

**1954 год. Верасень.** Пачалося абсталяванне радыёвузла БДУ.

**1 верасня 1955 года.** Герой «Молодой гвардии» Георгій Аруцюнян пабываў у гасцях у студэнтаў універсітэта.

**1956 год. Верасень.** Праф. БДУ К. І. Лукашоў у якасці дэлегата ад АН БССР удзельнічаў у працы XX Міжнароднага геалагічнага кангрэса ў Мексіцы.

**1961 год. Верасень.** Адкрыты падрыхтоўчы факультэт для замежных грамадзян. Пачалі вучобу 62 прадстаўнікі Рэспублікі Куба.

**1963 год. Верасень.** На ўсіх факультэтах уведзены новыя навучальныя планы. На фізічным факультэце ўтворана новае аддзяленне па спецыяльнасці «Радыёфізіка і электроніка».

***(Пачатак. Працяг на 3-й ст.).***

# РЭЙД ДАІ: «НЕ ПІ ЗА РУЛЁМ»

Па начной вуліцы Маскоўскага раёна з перавышэннем дапушчальнай хуткасці імчаўся «Фольксваген». Аўтамабіль не падпарадкаваўся сігналу міліцыянера спыніцца і той, спыняючы небяспечны для навакольных рух, паводле закона разрадзіў у машыну пісталет. Хмель перашкодзіў парушальніку рэальна ацаніць абстаноўку і пакаяцца ў тым, што сеў за руль п'яным. Ён стаў пагражаць міліцыянерам, за што (апроч усяго іншага) быў адпраўлены «астыць» на 15 сутак.

За мінулае паўгоддзе ў Маскоўскім раёне затрымана больш за трыста вадзіцеляў, якія ў нецвярозым стане кіравалі аўтамабілем ці трактарам.

Падчас праверкі быў затрыманы вадзіцель аўтабазы Белдзяржуніверсітэта Куліч. Не працверазеўшы пасля начной выпіўкі, ён спрабаваў на мікрааўтобусе самавольна выехаць з тэрыторыі аўтагаспадаркі, не маючы ні правоў, ні дакументаў на аўтамабіль, ні дарожнага ліста. Адзначаў, маўляў, дзень нараджэння ў сябра, дзе дакументы — не памятае. Што ж, прыйдзецца яму на некалькі гадоў змяніць работу.

За мінулае паўгоддзе па рэспубліцы работнікамі ДАІ затрымана 32622 вадзіцелі, якія знаходзіліся п'янымі за рулём.

На дарозе павінен быць цвярозы вадзіцель, які гарантуе бяспечны рух для ўсіх яго ўдзельнікаў.

**Дзяржаўтаінспектар Маскоўскага ДАІ А. ДЗЕРГАЧОЎ**




● ЗДАРОЎЕ

# ПРА ТУБЕРКУЛЁЗ

*Пачаўся навучальны год. І зноў усім студэнтам прыйдзецца праходзіць штогадовы медыцынскі агляд. Справа, трэба сказаць, не вельмі паважаная моладдзю: чэргі да дактароў, флюараграфія, якую, здаецца, больш за ўсё не любяць студэнты, нават лічаць шкоднай для здароўя. Але гэта не так.*

*Сёння наша гаворка пойдзе пра адно з самых цяжкіх інфекцыйных захворванняў — туберкулёз. Пра неабходнасць своечасовага выяўлення гэтага захворвання і аб яго прафілактыцы распавядае ўрач 2-й гарадской клінічнай бальніцы І. М. ВАЛЫНЕЦ.*

Туберкулёз — інфекцыйнае захворванне. Выклікаецца яно палачкай Коха, якая вельмі ўстойлівая да уздзеяння неспрыяльных фактараў знешняга асяроддзя. Вытокам распаўсюджвання інфекцыі з'яўляецца хворы на туберкулёз чалавек, які выдзяляе пры кашлі, чханні, смеху добныя кропелькі сліны. З паветрам бактэрыі пранікаюць у лёгкіе.

Туберкулёзам пакутуюць людзі рознага ўзросту і полу. Пры гэтым захворванні могуць паражацца не толькі лёгкія, але і іншыя органы: косці, вочы, скура, ныркі, лімфатычныя і нервовыя сістэмы. Захворванне пачынаецца з павышэння тэмпературы цела, патлівасці па начах, пагаршаецца сон і апетыт. Рашучая роля ў распазнанні пачатковых форм туберкулёза лёгкіх належыць рэнтгеналагічнаму метаду даследвання. Такім шляхам атрымліваецца выявіць захворванне і ў тых выпадках, калі яно не выяўляецца іншымі прыкметамі або працякае пад выглядам грыпа, бранхіта і іншых захворванняў.

Прафілактыка — аснова барацьбы з туберкулёзам. Вялікую ролю адыгрываюць меры, накіраваныя на павышэнне супраціўлення арганізма туберкулёзнай інфекцыі: фізічная культура, трэніроўка, закаліванне.

Флюарагарафія — метад ранняга выяўлення туберкулёза. Для своечасовага выяўлення захворванняў лёгкіх праходзьце штогадова флюараграфічнае абследванне. Прамянёвая нагрузка пры флюараграфічным абследванні не аказвае шкоднага ўплыву на арганізм. Выяўленыя ў самым пачатку захворванні пры лячэнні прыводзяць да выздараўлення.

● ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

# ВЕРАСЕНЬ

*(Працяг. Пачатак на 2-ой стар.).*

**1 верасня 1971 года.** Ва універсітэце адбылося свята ведаў. Надрукавана Пастанова пра агляд-конкурс факультэтаў і кафедраў універсітэта на лепшую арганізацыю навукова-даследчай работы студэнтаў.

**30 верасня 1974 года.** У БДУ пачаўся тыдзень сяброўства, прысвечаны 25-годдзю стварэння ГДР. Адбылося ўрачыстае паседжанне, прысвечанае юбілею ГДР.

Верасень. Адкрыты навукова-метадычны факультэт універсітэта. Адбылася першая савецка-балгарская навуковая студэнцкая канферэнцыя.

**1977 год. Верасень.** Студэнтка фізічнага факультэта І. Потэс заваявала званне абсалютнай чэмпіёнкі краіны па водналыжнаму спорту.

**1979 год. Верасень.** У музей універсітэта перададзены скарб залатых і срэбраных упрыгожванняў, грашовых срэбных злiткаў — грыўнаў. Скарб, падобнага якому яшчэ не знаходзілі на тэрыторыі Беларусі, быў знойдзены археалагічнай экспедыцыяй БДУ ў ходзе раскопак каля вёскі Вішчын Рагачоўскага раёна.

На кафедры псіхалогіі ўсталявана ўстаноўка для вывучэння характарыстык мозга чалавека. Пачаліся даследванні ўплыву складанага гукавага раздражняльніка на змяненне гэтых характарыстык.

**1980 год. Верасень.** На чэмпіянаце Еўропы ў Лондане выпускніца фізічнага факультэта І. Потэс заваявала срэбны медаль па водналыжнаму спорту.

**30 верасня 1981 года.** Са студзеня па верасень 1981 года па ільготных пуцёўках прафсаюза адпачылі і папраўілі сваё здароўе 1570 студэнтаў.

**1984 год. Верасень.** У гонар 50-годдзя геаграфічнага факультэта ва універсітэцкім гарадку высаджана «прысада географаў».

● САКРЭТ ФІРМЫ

## БУДАТРАДЫ — НЕ Ў ПАШАНЕ?

Гэтым летам у Гродзенскай вобласці не працаваў ніводзін будаўнічы студэнцкі атрад. Ліга добраахвотнай працы моладзі ў Гродне здолела арганізаваць толькі некалькі будатрадаў — на Стаўраполле і ў Крым. Жадаючых папрацаваць было шмат, і патрэбна было праводзіць конкурс.

## ЧУТКА АД ЗБС

***З мэтай паралізаваць працу Задзіночання Беларускіх Студэнтаў невядомы зламыснік знёс 30 метраў тэлефоннага кабеля з-пад дома старшыні Рады ЗБС Антося Бокуна. Аб тым, як прарэагаваў на гэта Антось, можна толькі здагадвацца.***

## У ГРОДЗЕНСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

Некалькі новых спецыяльнасцяў і факультэтаў адкрыліся 1 верасня ў Гродзенскім універсітэце. Напрыклад, выхаванцы факультэта эканамічнай кібернетыкі будуць мець шанц працаваць у банкаўскай сістэме. Першы набор зрабіў факультэт замежных моў (спецыяльнасць «Класічная мова і літаратура», а таксама руская мова як замежная — яе будуць вывучаць тут замежныя студэнты).

# З ЖЫЦЦЯ АДПАЧЫВАЛЬНІКАЎ

**— Ды што ж такое?... Госпадзя-а... Калі ж карміць будуць? — выдыхнула ўкраінка Оля.— Сашк, збегай глянь, што даюць...**

**— Чаго-чаго...— гмыкнуў вельмі тоўсты мужчына ў стракатых шортах, — кашу даюць!**

**— Мы тут хутка ўсе птушкамі станем,— сказаў Слава, кіраўнік нашай групы, высунуўшы падбародак.**

**— А што, вельмі карысна,— умяшалася жанчына з педагагічным выразам твару.— Нарэшце мае дзеці зразумеюць, як добра кормяць дома!**

**Лавачка ажыўлена загула. У чарговы раз загаварылі аб карыснасці кашаў, потым перайшлі на дыеты, яшчэ раз высветлілі, хто кім з'яўляецца па гараскопу. Абмеркавалі разнастайныя выпадкі ўзнікнення радзімак... Усё як заўжды.**

**Змена падыходзіла да канца. Усе мы даволі-такі стаміліся і ад сонца, і ад мора, і ўвогуле ад усяго таго, што называецца поўднем. Хацелася дадому. Хацелася не таму, што нясмачна, не ў час і аднастайна кармілі. Не таму, што замест абяцаных у кожным доміку тэлевізара і халадзільніка яны былі па адным на ўсю базу... Не таму, што абсалютна нечакана для адміністрацыі прыехала сто лішніх чалавек, і домік, напрыклад, разлічаны на чацвярых, атрымліваўся на семярых...**

**У рэшце рэшт, прывыклі да ўсяго. І да жудаснага ляманту ў сем гадзін раніцы: «Светка! Тонька! Марш на кухню... вашу маць...» І да нясмачнай кашы бралі свае памідоры. А калі хацелася есці, налаўчыліся пры дапамозе кіпяцільніка варыць у чайніку яйкі і бульбу. І чаргу ў душ цярпліва выстойвалі, і нудныя вечары навучыліся каратаць на лавачцы, бо кіно будзе, калі будзе бензін...**

**Ад'язджалі не толькі з пачуццём радасці, але і... падманутасці. Мы заплацілі грошы, а нас ашукалі, пачынаючы з пярлоўкі і скончваючы невыдадзеным дарожным пайком! Нас там ніхто не чакаў.**

**Да апошняга часу, калі ўсё пачало разбурацца, кожнаму з нас даводзілася адпачываць на паўднёвым узбярэжжы. Заплаціўшы невялікія грошы, можна было быць перакананым у прыстойным кавалку мяса на абед, належнай увазе з боку персаналу і г. д. А яшчэ экскурсіі, вечары самадзейнасці і песні, што-небудзь кшталту «...а рядом тихо проплывает красавец — белый пароход». Альбо што-небудзь іншае. Не істотна. Галоўнае, што нас тады чакалі. Дый сёння чакаюць. Там, дзе больш заплоціш. Але такія базы адпачынку, дзе не чакаюць, таксама не будуць пуставаць. Нават сто лішніх чалавек знойдзецца.**



**— Сашк! Ну што там даюць?**

**— Яшчэ не накрылі!**

Адпачывала
Марына ГУЛЯЕВА

# НАТАТКІ З МІЖНАРОДНАГА ХРЫСЦІЯНСКАГА ФЕСТЫВАЛЮ ЯЎРЭЙСКАЙ МУЗЫКІ І ТАНЦА

● ФЕСТЫВАЛІ

— Шалом алейхем! — радасна віталі сваіх гасцей арганізатары фестывалю, які праходзіў 17, 18, 19 жніўня ў Палацы спорту ў Мінску.

Гукі музыкі і песень, пяшчотныя ўсмешкі і добразычлівыя погляды нікога не пакідалі абыякавым. Зала была ўжо перапоўнена, але да шматтысячнага натоўпу каля ўваходу ў Палац усё далучаліся і далучаліся людзі. Такога наплыву не чакалі нават самі арганізатары фестывалю — прадстаўнікі Месіянскага Яўрэйскага цэнтра з Санкт-Пецярбурга на чале з месіянскім равінам-настаўнікам Джанатанам Бернісам і мінскай царквы Ісуса Хрыста на чале з пастарам Веніямінам Брухам. Далёка не ўсім жадаючым пашанцавала трапіць у залу, але шчаслівчыкі сталі сведкамі і ўдзельнікамі дзівоснага відовішча. Таму што гэта было сапраўды свята як для яўрэйскага, так і для беларускага народаў. Бясплатны ўваход і шчодра раздорваемая літаратура, безумоўна, адыгралі пэўную ролю. Пакрыўдзілі мы ці не, але толькі відаць было, што людзі прывыкаем карыстацца танным абсталяваннем, купляць прадукты ў тых магазінах, дзе танней, і адпаведна шукаем танных, а яшчэ лепш бясплатных, забаў. Аднак справа не толькі ў гэтым. Проста стаміліся людзі ад нестабільнасці ў эканоміцы і ў жыцці, ад чэргаў у магазінах і бясконцай пагоні за заўтрашнім днём. Агрэсіўнасцю і злосцю ўсё часцей і часцей маскіруецца пачуццё болю і адзіноты, якое пуглівай птушкай затаілася ў сэрцах людзей. Жаданне атрымаць разуменне, спакой, стабільнасць прыводзіць людзей да Бога. Прычым зусім незалежна ад таго, як клічуць гэтага Бога — Іешуа ці Ісус Хрыстос...

Канцэрты фестывалю былі прысвечаны памяці яўрэяў — ахвяр генацыду на шматпакутнай беларускай зямлі ў час Вялікай Айчыннай вайны, а таксама асацыяцыі яўрэяў — былых вязняў гета. «Мы спадзяемся, — казаў Д. Берніс, звяртаючыся да гледачоў, — што Бог нейкім чынам зменіць боль, гора і пакуты на радасць!» І мяне, хаця я не вельмі веруючы чалавек і прывыкла разлічваць перш на свае асабістыя сілы, чым на боскія, надта здзівілі змены, якія адбыліся з публікай. Зала нібы свяцілася ад мноства шчаслівых усмешак і добрых поглядаў. І не было месца злосці і болю. Акрамя беларусаў на фестывалі прысутнічалі госці з Канады, Англіі, ЗША, але нягледзячы на розніцу моў, панавала абсалютнае ўзаемаразуменне. Многія з замежных гасцей да пачатку Вялікай Айчыннай вайны мелі на Беларусі свае карані. І сёння ім, па словах Д. Берніса, вельмі хацелася хоць што-небудзь зрабіць для зямлі сваіх продкаў і для людзей, якія жывуць на ёй.

— Бог, увайдзі ў гэты свет! — праніклівa, нібы блаславўляючы, казаў адзін са спевакоў, Джанатан Сэтэл, які зараз жыве ў Ізраілі. Сваю кар'еру ён пачаў яшчэ ў кампаніі Уолта Дыснея, а зараз спявае яўрэйскія і ізраільскія песні па ўсім свеце.

Атмасфера ў зале была настолькі сардэчная і пяшчотная, што публіка нагадвала вялікую дружную сям'ю. Мелодыі песень Віктара Кліменкі надзвычай збліжалі ўсіх прысутных. Кожны, здавалася, адчуваў у іх нешта сваё, роднае. Віктар нарадзіўся на Кубані, у сям'і казака. Яго жыццё склалася так, што ён яшчэ ў маленстве трапіў за мяжу. Будучы ўкраінцам па паходжанню, ён палюбіў яўрэйскую музыку, песні, якія зараз і выконвае. Аднак не ўсё ў жыцці Віктара было так проста, як здаецца на першы погляд. Пажыўшы за мяжой, ён адчуў, што такое быць эмігрантам, быць вандроўнікам сярод вандроўнікаў. Калі ты зусім чужы і нікому не патрэбны! І калі так важна, каб цябе любілі!.. «Можа, і яўрэі, — казаў ён,— таксама вандроўнікі сярод вандроўнікаў?.. І можа, яны таксама жадаюць, каб іх любілі і казалі ім добрыя словы?..»

Узяўшыся за рукі і стварыўшы кола, яўрэйскія танцы з задавальненнем танцавалі і жанчыны, і мужчыны, і дзеці, і старыя, і моладзь. Не залежна — яўрэі яны ці беларусы. Цікавая рэч. Немудрагелістыя рухі гэтых танцаў нагадалі амаль пазабываныя чамусьці зараз танцы беларускага, рускага, малдаўскага народаў, без якіх раней не абыходзілася ніводнае свята. «Енька», «Маладавяснянка», — памятаеце?! Можа, гэта і ёсць сведчанне ўсеагульнага братэрства, у якім мы ніяк не хочам сабе прызнацца, гаворачы на яўрэяў «жыд» ці, прабачце, «сволач»? Але згадзіцеся, у кожнага народа ёсць свае недахопы і свае добрыя якасці. Чаму ж мы яўрэяў ацэньваем толькі па іх недахопах?

Глядзела я на шумную вясёлую залу, на добрыя ўсмешкі, і так светла і хораша станавілася на душы. Таму што ў гэты час усім ім: беларусам, яўрэям, рускім — было цёпла і ўтульна побач адзін з адным. І ніхто, я ўпэўнена, не адчуваў сябе чужым, раптоўна трапіўшым вандроўнікам. Вельмі запаў у душу эпізод, які мне давялося назіраць у час аднаго з канцэртаў. Маленькі бялявы хлапчук, які сядзеў побач са мной на каленях у мамы, пэўна, стаміўшыся, захныкаў і папрасіў піць. У перапоўненай зале, ды яшчэ пасярод канцэрта — гэта праблема. Але маці не прыйшлося доўга клапаціцца, бо з папярэдняга шэрага зусім незнаёмая жанчына-яўрэйка, ласкава пасміхаючыся, працягнула бутэльку з напіткам і «Снікерс».

Канцэрт скончыўся. Гамонячы, пачалі разыходзіцца людзі. А я яшчэ доўга не магла забыць словаў Віктара Кліменкі, і мне так хацелася верыць, што пасля гэтага фестывалю беларусы (хоць бы тыя, хто прысутнічаў) стануць інакш ставіцца да сваіх братоў-яўрэяў...

**Вольга ХАДАРЭНКА.**

# ТУСОЎКА

## СТАРОНКА ДЛЯ МЕЛАМАНАЎ

# МЕЛАДЫЧНЫ «ТЭЎТОНСКІ» МЕТАЛ «СКОРПІЁНС»

Среди большой базарной толпы каждый знает, кто такие «Скорпы».
(з прымавак Камароўскага рынку).



Фота Аляксея СУПРУНА.

***Спецыяльна для чытачоў «Беларускага універсітэта» прэзідэнт Мінскага рок-клуба Уладзімір Зайчанка, аўтар шматлікіх вядомых у вузкім коле песень, чалавек, які пра сур'ёзную музыку піша сур'ёзна, таму што матэрыялы пра яе збіраліся ў розных замежных выданнях, перакладаліся, сістэматызаваліся ім і яго сябрамі ўсё апошняе дзесяцігоддзе. У гэтым нумары «Беларускага універсітэта» — пачатак артыкула пра вядомы ва ўсім свеце гурт «Скорпіёнс».***

## ДЗВЕ ЦЯЖКІЯ «ПЯЦІГОДКІ»

Пра «Скарпіёнаў» ніяк нельга сказаць, што іх узлёт на сусветны музычны Алімп і сённяшняя яркая слава і прызнанне прыйшлі імкліва і нечакана. Хаця ад шматлікіх (і збольшага — маловядомых у свеце) нямецкіх гуртоў, якія граюць хард-рок і метал, «Скорпіёнс» з Гановера тым і адрозніваецца, што яго музыканты здолелі прабіцца на самы пярэдні край сярод большасці амерыканскіх і англійскіх рок-зорак.

Для гэтага поспеху спатрэбілася цэлых дзесяць гадоў, неаднаразовыя замены ў складзе гурта, цяжкая, упартая работа ў студыі і серыі шматгадовых працяглых знясільваючых турне па свету ў якасці гурта для «разагрэву» публікі, раней чым «Скарпіёны» былі заўважаны.

Першым больш-менш паспяховым альбомам стала іх кружэлка « У Трансе», якая выйшла ў кастрычніку 1975 года. Яна супала з дзесяцігоддзем гурта. Менавіта дзесяць год таму, у 1965 годзе, 17-гадовы гітарыст Рудольф Шэнкер арганізаваў са сваімі школьнымі сябрамі гурт, назваўшы яго атрутна — забойным тытулам «Скарпіёны». На навагоднім вечары 31 снежня 1969 года ўпершыню з гуртом выступіў малодшы брат Рудольфа Майкл Шэнкер — сола-гітарыст ансамбля. У наступным, 1970 годзе ў «Скарпіёнаў» з'яўляецца іх нязменны вакаліст Клаўс Мейн, якога пераманілі з мясцовага саперніцкага гурта «Капернікус». За таго часу характэрны голас Мейна стаў на доўгія гады візітнай карткай «Скарпіёнаў», рабіў іх песні такімі запамінальнымі і адрознымі ад іншых металічных гуртоў.

Дапоўнілі калектыў бас-гітарыст Ломар Хэмберг і ўдарнік Вольфганг Дзіёну. Менавіта ў такім складзе школьнікі з Гановера і сталі прафесійным гуртом у 1971 годзе, а ў наступным годзе яны падпісалі кантракт на сваю першую кружэлку. «Мы гралі хард-рок, падобны да музыкі «Лед Зэпелін», — узгадвае Рудольф Шэнкер. І пасля двух гадоў работы з Мейнам яны наважыліся запісаць свой першы дэбютны альбом «Адзінокая Варона», які з'явіўся ў лютым 1972 года. «Музыка злёгку нагадвала стары «Крым» і «Лед Зэпелін», але гэта толькі даказвала, што мы можам граць рок-н-рол», — узгадваў Мейн. Альбом добра прадаваўся ў Еўропе, трапіў нават на нейкія месцы ў хіт-парадах, і праз гэта гурт заўважылі і ўзялі адкрываць канцэрты больш вядомых зорак. Доўгі час «Скорпіёнс» проста «разварушвалі» публіку, гралі толькі сорак хвілін у першым аддзяленні.

У 1972 годзе музыканты ўдзельнічалі ў турне з вядомымі «Атамнымі Пеўнямі» («Атамік Рустэр») — гуртом віртуознага шатландскага гітарыста Роры Галахера — і ярка ззяючымі ў промнях сусветнай славы брытанцамі «Юрай Хіп», якія ў той час пасля выпуску сваіх легендарных альбомаў «Паглядзі на сябе» і «Дэманы і Ведзьмакі» (за мінулыя дваццаць гадоў гэтыя дыскі ўжо сталі класікай рока і нават не так даўно нарэшце з'явіліся ў продажы ў нашых крамах кружэлак), вядома ж, былі настолькі надзвычайнымі і значнымі, што побач з імі учарашнія школьнікі былі проста незаўважнымі.

Аднак калі цалкам гурт пакуль мала прыцягваў увагі, то некаторыя асобныя музыканты ў ім выклікалі да сябе павышаную цікаўнасць. Так, у сумесным турне з «ЮФО» па Германіі ўжо на другі дзень вакаліст «Неапазнанага Лятаючага Аб'екта» і лідэр гурта Філ Муг заўважыў бялявага сола-гітарыста «Скарпіёнаў» Майкла Шэнкера і вырашыў, што той са сваёй знешнасцю і добрай гітарнай тэхнікай будзе вартым дадаткам у яго ўласнай камандзе.

«Майкл Шэнкер быў неверагодна здольным. Ён быў як малыш, але калі пачынаў граць, дык станавіўся зусім неймаверным. Гэта было ў нейкай ступені нядобра «выкрасці» яго з гурта падчас турне, — узгадвае Рудольф Шэнкер. — Але так, напэўна, было лепш усім...»

Сапраўды, 17-гадовы Майкл Шэнкер быў узбударажаны прапановай такой бліскучай музычнай кар'еры ў «сапраўдным англійскім» гурце. Ён пакідае «Скорпіёнс», робіцца сола-гітарыстам «ЮФО» і пераязджае жыць у Лондан, дзе і застаецца працаваць надалей. Забягаючы наперад, адзначым, што ў «ЮФО» Майкл прабыў шэсць гадоў, а ў 1979 арганізаваў сваю ўласную групу «МСГ», якая хутка заваявала ў пачатку 80-х сусветную вядомасць.

А ў тым 1973 годзе Рудольф Шэнкер даволі спакойна дапусціў, каб яго малодшы брат быў пераманены ў чужы гурт, хаця і абяцаў бацьку сачыць за Майклам, «як ястраб». Зрэшты, магчыма, гэта ўваходзіла ў «тактычныя» планы старэйшага Шэнкера, і вельмі хутка ён сфармаваў новы склад, у якім з'явіўся нязменны і дагэгуль бас-гітарыст Францііш Бухальц, ударнік Юрген Разенталь і новы бліскучы гітарыст Ульрых Руз — вельмі яркая эгацэнтрычная асоба, які дзякуючы свайму знешняму выгляду, а галоўнае выключна індывідуальнаму гітарнаму стылю ігры на сваім «страталастэры», зрабіў гурт прыкметным і папулярным. Ульрых Руз, названы «тайным сынам» Джымі Хендрыкса і Джэфа Бэка, сваімі віртуозна пераліўістымі гітарнымі гукамі дапамог гурту граць і знайсці той самы славуты «рок дзівоснага лірызму і бляску», які і зрабіў «Скорпіёнс» папулярнымі.

Усяго праз два месяцы пасля з'яўлення Ульрыха ў гурце музыканты ўпершыню з поспехам выступілі на германскім тэлебачанні на фестывалі рок-гуртоў, дзе іх песні атрымалі міжнародную славу. Затым быў запісаны другі альбом — «Палёт да Вясёлкі».

1975 год пачаўся шматлікімі турне па Францыі і Бельгіі сумесна з гуртом «Світ». У кастрычніку таго ж года — першы канцэрт у Англіі. І ў тым жа кастрычніку, як вынік іх дзесяцігоддзя, выходзіць ужо згаданы альбом «У Трансе», дзе лямантуючаму голасу Клаўса Мейна, натхнёнага вакалам Яна Гілана, акампаніравала «шалёная і вар'яцкая», але тэхнічная гітара Ульрыха Руза. Альбом атрымаў шырокую вядомасць, перыяд станаўлення гурта скончыўся. Пачалася дарога да славы.

## ЦЯЖКАЯ ДАРОГА Ў АМЕРЫКУ

Здавалася б, усё ішло цудоўна. У 1976 годзе — выхад гурта на рок-сцэну ў Англіі, Аўстрыі, Галандыі, Бельгіі, Люксембургу, Швецыі. У лістападзе 1976 года выйшаў альбом «Дзева-забойца» з фотаздымкам голай дзяўчынкі-падлетка на вокладцы, што выклікала лёгкі скандал у некаторых асабліва маралістычных краінах. У 1977 годзе — новыя турне па Германіі (студзень), Англіі (люты). Затым у гурце з'яўляецца пяты па ліку ўдарнік — Герман Рарэбел, які і па сёння грае ў «Скорпіёнс». У жніўні выходзіць іх пяты альбом — «Узяты Сілком». У 1978 годзе — вялікае турне па Японіі і запіс двайнога канцэртнага альбома «Такійскія Запісы», куды ўвайшлі два канцэрты ў сталіцы, а сам альбом заняў месца ў сусветным хіт-парадзе рок-кружэлак.

На першы погляд усё было цудоўна, але на самой справе гурт перажываў цяжкі перыяд. Музыканты былі папулярнымі ў Еўропе, але ў Амерыцы іх ведалі вельмі мала. Іх фірма РСА адмовіла ім у падтрымцы турне па ЗША і «Скорпіёнс» былі асуджаны на невядомасць у Штатах.

«Гэта быў неймаверна няўдалы перыяд для нас, — узгадвае Рудольф Шэнкер. — Мы рабілі музыку і атрымлівалі прызнанне ў Еўропе. Але ў Амерыцы нас ніхто не ведаў. Кампаніі запісу ў адзін голас сцвярджалі, што ў Амерыцы такі тып музыкі не карыстаецца поспехам. Яны ўсе адмаўляліся дапамагчы нам. Я заўжды ім казаў: «Калі вы дасцё нам шанец, мы дакажам, што вы не маеце рацыі». Але яны не хацелі слухаць. Каля пяці гадоў мы чакалі, што настануць перамены».

І вось пасля выхаду «Такійскіх Запісаў» кантракт з фірмай РСА падышоў да канца і гурт вырашыў яго не ўзнаўляць, а адкрыў сваю «кантору» свабоднага агенцтва з маркай «абноўленага камерцыйнага рок-н-рола». Надышлі такія часы, калі яны маглі ўжо выбіраць сабе больш выгадныя кантракты. Абмеркаваўшы ўсе прапановы, гурт у рэшце рэшт падпісаў дамову з «Фанаграм». Гісторыя абяцала даць ім шанец. «Тое, што мы хацелі, усё яны нам далі», — узгадвае Шэнкер. Але праблемы гурта на гэтым не скончыліся.

Праз некалькі дзён пасля падпісання іх новага кантракта Ульрых Руз вырашыў пакінуць гурт. Ульрых вырашыў, што з яго дастаткова гэтых бясконцых і працяглых канцэртных турне і ён «болей не хоча не быць дома па восем месяцаў запар». Апроч гэтага ў яго ўжо былі меркаванні пачаць уласную сольную кар'еру. Забягаючы наперад, можна сказаць, што ён запісаў два альбомы (1979 і 1980 гг.) са сваім гуртом «Электрычнае Сонца», меў пэўны поспех, але пасля знік у невядомасць.

Сыход Ульрыха паставіў гурт у жахлівае становішча. «Мы ўпершыню былі на падыходзе да Амерыкі і раптам пазбавіліся гітарыста, — казаў Герман Рарэбел. — На шчасце, Майкл Шэнкер якраз сышоў з «ЮФО» і ён дапамог нам закончыць запіс альбома».

Але, канешне, усё было не так ідэальна, як хацелася б. Малодшы Шэнкер быў сам у вельмі благім стане пасля сыходу з «ЮФО». Ён раптоўна з'явіўся ў студыі «Скорпіёнс» і, прабыўшы там толькі тыдзень, паспеў давесці ўсіх да стрэсу падчас запісу. Майкл ад'ехаў назад, пакінуўшы ўсіх са сваімі праблемамі. Можа, у яго і былі якія-небудзь меркаванні наконт магчымай работы ў «Скорпіёнс». Але пасля тыднёвага знаходжання ён знайшоў іх справы не такімі бліскучымі, як думаў. А можа, і сам не ведаў, што ж яму трэба ці проста хацеў давесці ўсіх да шокавага стану.

Але гурт і гэтым разам даволі хутка знайшоў замену. Гэта была апошняя, сёмая замена ў гісторыі «Скорпіёнс». Новым і сталым гітарыстам становіцца Маціяс Джабс, які раней граў у клубным гурце «Фарго», што выконваў кампазіцыі «Скорпіёнс». Ён хутка адаптаваўся, бо па свайму музычнаму ўзроўню вырас да ўзроўню «Скорпіёнс». «Ён быў натуральным дадаткам у гурце і ад самага пачатку паказаў выдатныя здольнасці — тлумачыць Герман Рарэбел. — Ён па-сапраўднаму адчуваў нашу музыку. Ён жа слухаў яе і граў гэта яшчэ ў клубах. Ён здольны быў ісці з намі далей і ўжо ў альбом «Любоўная паездка» зрабіў свой уклад».

І вось, нарэшце, пасля чарговага турне па Еўропе і Японіі калектыў упершыню з'яўляецца ў ЗША. Гэта была восень 1979 года — першы поспех у Штатах. Трэба адзначыць, што і тут «Скорпіёнс» былі арыгінальнымі, і ў адрозненне ад большасці другіх рок-гуртоў, якія, як звычайпа, імкнуцца «заваяваць» спачатку Амерыку, а ўжо потым увесь свет, яны ўжо мелі да гэтага часу трывалую сусветную вядомасць і прыехалі ў Амерыку на крылах сваёй славы.

Амерыканскія рок-фэны доўга адкрывалі для сябе чароўнасць металу ў іх меладычным музычным тэроры. «Поспех быў большым, чым мы нават чакалі, і гэта было ўзнагародай для нас, — узгадваў Герман Рарэбел. — Калі ты з Англіі або Амерыкі, ты павінен ісці па традыцыйнаму шляху, калі хочаш стаць рок-гуртом з поспехам. Але калі ты з Германіі, ты не павінен трымацца гэтай традыцыі. Мы былі першым нямецкім гуртом, які рэальна дамогся міжнароднага поспеху. Калі робіш нешта для Амерыкі ці Англіі, гэта мусіць быць штосьці звышновае. Мы адчувалі, што мы перамаглі, але, можа быць, зусім выпадкова».

«Усё гэта, вядома, вельмі забаўна, — дадае Шэнкер. — Калі гурт упершыню пачынаў, мы не хацелі рабіць нешта такое вялікае. Нам нібыта пашанцавала. Цяпер мы маем поспех. Я магу азірнуцца і пасмяяцца з нашых сумненняў і роздумаў. Гэта была доўгая барацьба за «нашае сёння», але я не спыню яе і зараз ні на хвіліну».



Фота Аляксея СУПРУНА.

Вось такія цікавыя выказванні з нагоды заваявання Амерыкі. Канешне, не ўсё тут трэба прымаць на веру, і ў заявах, што іх перамогі «зусім выпадковыя» і гурту «проста пашанцавала», адчуваецца відавочнае какецтва і спробы схаваць тыя грамадныя тытанічныя намаганні, якія прыкладалі музыканты «Скорпіёнс», каб заваяваць Амерыку. Ну, а пасля гэтай перамогі можна ўжо і крыху пафантазіраваць — мэта дасягнута.

***(Пачатак. Працяг у наступным нумары).***

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

8 верасня
Зак. 1774.
Т. 1000 экз.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 411—412
ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

В. а. рэдактара
Т. М. КАЗАК

*Газета падпісана ў друк у 16.00.*